4. Там жа, С. 42.
5. ЭМ ВМС і БТ імя Ф.Р. Шклярава. Сш. 87, л. 111, 112. Запісала ад П.А. Грыбанавай, 1920 г.н., у в. Верхлічы Краснагорскага р. Бранскай вобл. 19.05. 1999 г. Л.Д. Раманава.
6. ЭМ ВМС і БТ імя Ф.Р. Шклярава. Сш. 87, л. 99. Запісала ад І.К. Цімашэнкі, 1921 г.н., у в. Верхлічы Краснагорскага р. Бранскай вобл. 19.05. 1999 г. Л.Д. Раманава.
7. Алексиевич, С.А. Чернобыльская молитва: Хроника будущего / С.А. Алексиевич. – М. : Время, 2013. – 304 с. – (Собр. произв., с. 175).
8. ЭМ ВМС і БТ імя Ф.Р. Шклярава. Сш.87, л. 102. Запісала ад І.К. Цімашэнкі, 1921 г.н., у в. Верхлічы Краснагорскага р. Бранскай вобл. 19.05. 1999 г. Л.Д. Раманава.

***Яніна Грыневіч***

## КАНЦЭПТ «ДАРОГА» Ў БЕЛАРУСКІХ ПАЗААБРАДАВЫХ ЛІРЫЧНЫХ ПЕСНЯХ

Адным з найбольш частотных элементаў ландшафтна-тапаграфічнага кода беларускіх пазаабрадавых лірычных песень з’яўляецца *дарога* (для параўнання: у зборніку «Лірычныя песні» (склад. Н.С.Гілевіч) [1] лексема «дарога» ўжываецца 136 разоў, часцей сустракаюцца толькі лексемы «*конь*» – 248, «*доля*» – 167, «*сад*» – 163, «*поле*» – 151). Вывучэнню канцэпту прысвечаны раздзел «Дарога ў традыцыйнай карціне свету беларусаў» у манаграфіі У.А.Лобача «Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве» [3, с. 314–347], яго ж артыкул «Дарога» ў энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў» [2, с. 140–141]. У названых работах аўтар, на падставе аналізу шырокага кола крыніц, вызначае семіятычны статус дарогі ў беларускай міфалагічнай традыцыі, аднак жанры песеннага фальклору ім не ўлічваюцца.

Мэта артыкула – выявіць семантыку, месца ў карціне свету і асаблівасці функцыянавання канцэпту дарога ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях.

У творах лексема дарога (варыянты *дарожанька, дарожачка, дарожка, сцежкі-дарожкі*) мае сінонімы *гасцінец, шлях, сцежка, пуць*: «А як мамкі не будзіць, // гасціці недзе будзіць. // А як мамачка памрэць – // *дарожачка* зарасцець. // Ой, пайшла б я лясамі – // ўсе лясы паваляны: // дуб’ікам, бярэзнічкам, // маладым алешнічкам. // Ой, пайшла б я лугамі – // ўсе лугі пакошаны // густымі пракосамі. // Ой, пайшла б я й палямі – // ўсе палі папаханы // ўсякаю сяўбіцаю, // ячмянём, пшаніцаю. // Зараслі ўсе *пуці* – // куды к мамачцы ісці?» [1, с. 221]. Апазітам *дарозе* (па прымеце роўны/няроўны) з’яўляецца *біты шлях*, *гасцінец біты*; па прымеце апрацаваны/неапрацаваны – *пожня*: «– А божа ж ты мой мілюсенькі, // вядзі мяне да татусенькі. // Не вядзі мяне ў сад-вінаград, // вядзі мяне да матуленькі назад. // Не вядзі мяне *па пожаньцы*, // вядзі мяне *па дарожаньцы*. // *Па пожаньцы* мае ножкі не йдуць, // *па дарожцы* яны самі бягуць» [1, с. 243].

Дарога ў песнях нярэдка выступае **суб’ектам дзеяння**: яна *ідзе, стучыць, есць, стогне*, што ўказвае на дынамічнасць вобраза. Разам з тым з’яўляецца **аб’ектам дзеяння**: дарогу *пытаюць, ад’язджаюць у, сабіраюцца ў, (не) знаюць, загадваюць у, выпраўляюцца у, указваюць, укарочваюць, паглядаюць на, чакаюць з.* Але найчасцей яна выступае **локусам, месцам, на/над якім адбываюцца пэўныя дзеянні**: *ісці па, весці па, зарасці (травой, бярэзнікам, дуб’ём, асіннікам), пазавісаць (калінай зялёнай), пайсці па, завеяць, замятаць, араць, пахаваць на, каціць персцень, (не) збіцца з, ехаць, знайсці, натаміцца па, пакрапляць, паліваць, расці пры, збіцца з, вывесці на, пазакідаць, кідаць на, шукаць, прыблудзіць к, вывесці на, перасяліць, прыехаць з, начаваць у, бегчы па*: «– Прайшоў я свет, Украіну – // Не відзеў дзіва над *каліну*, // *Што ў лузе пры дарозе стаіць*: // На ей вецейкі без ветру шумяць, // На ей ягадкі без сонца спеюць, // На ей расіца без дожджу стаіць» [1, с. 286]. Таксама месцам дзеяння выступае і яе састаўная частка – край: «Запрагу я валы крутарогі // Ды паеду араць *край дарогі*. // Ды наару я поля шырокага, // Ды пасею я хмелю высокага, // Ды нажану ж я піва салодкага // Ды для свайго роду далёкага, // Ды й для бацькі і мамачкі, // Ды й для сястрыцы багатай» [1, с. 15].

У творах дарога з’яўляецца **прамежкам, які злучае пункты прасторы**: «Бяжы, коню, дарогаю, // Дарогаю шырокаю, // А там стаіць стара хатка. // Стукні, грукні ў вароцейка, // Ці не выйдзе стара бабка, // Стара бабка, мая матка. // Возьме цябе за цугелькі, // Павядзе аж да стаенькі. // Дасць табе аўса, сена, // Папытае свайго сына: // – А мой конік вараненькі, // Дзе ж мой сынок маладзенькі? // – А твой сынок маладзенькі // Узяў замуж паненачку. // Узяў замуж паненачку, // У чыстым полі быліначку» [1, с. 74].

З канцэптам *дарога* звязаны ўсе персанажы песень: дзяўчыну чакае дарога да шлюбу, на чужую старану, у няродную хату; хлопца – у чужы край, на Украіну, у Адэсу; маладзіцу – у бацькоўскую хату; мужа – на Украіну, на вайну; рэкрута (навабранца) – на вайсковую службу; салдата (казака, гусара) – на вайну, на чужую старану; чумака – у Крым і інш. Прычым дарога ў акрэсленых кантэкстах мае вызначальную ролю, падкрэслівае прамежкавы стан персанажаў, якія на ёй знаходзяцца. Ад таго, якой будзе дарога, залежыць далейшы лёс. Напрыклад, паводзіны каня ў дарозе прадказваюць далейшы лёс яго гаспадара: «Выпраўляла маці сына // ў *бальшую дарогу*. // – Едзь, едзь, мой сыночак, // ды назад вярніся. // – А бог знае, бог ведае, // назад ці вярнуся: // сярод двара шырокага // мой *конь спатыкнуўся*. // Палівайце сцежкі-дарожкі, // каб не было курна, // развражайце маю мамку, // каб не было нудна. // Дождж дарожку палівае – // дарожачка курна. // Радзіма мамку разважае, // а мамка ўсё нудна. // – Калі, калі, мой сыночак, // прыйдзе ка мне ў госці? // – Тады, тады, мая мамка, // прыйду к табе ў госці, // як вырасце травічачка // на новым памосце. // Расла, расла травічачка – // стала



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

пасыхаці. // Стала яго мамка часта // сына ўспамінаці. // Ляцеў пятух цераз рэку, // крыкнуў ку-ка-рэ-ку. // Не ўвідзела маці сына, // не ўвідзіць давеку» [1, с. 64–65]. Ад'езд у далёкую краіну, на чужыну – гэта «вялікая», «бальшая» дарога, якая можа суадносіцца са шляхам у іншасвет. Папярэднічае адпраўленню ў дарогу бацькоўскае павучанне.

Істотным аказваецца і час сутак, у які персанаж ад'язджае: «Як багатую сястру // на тры ночкі ўнімаюць, // а як мяне, худобачку, // а як мяне, бяздольніцу, // *напроць ночкі* выпраўляюць. // Як пайду я, як пайду // а барамі ды лясамі, // як запяю, худобачка, // як запяю, бяздольніца, // сваю жаласную песню: // «Сабярыцеся, звяры, // ваўкі і мядзведзі, // сабярыцеся ка мне, // разарвіце вы мяне» [1, с. 14]. Дарога «*напроць ночкі*» ўспрымаецца як вельмі небяспечная, паколькі гэты час сутак – перыяд актывізацыі нячыстай сілы. У. А. Лобач падкрэслівае, што «дарога ў шэрагу астатніх элементаў культурнай прасторы максімальна хранатапічная, і яе праходжанне чалавекам пазначана скразной сітуацыйнасцю. Злучыўшы разнародныя фрагменты (локусы) прасторы, месцы «благія» і «добрыя», «нячыстыя» і «святыя», дарога на розных яе этапах пераймае гэтую разнароднасць і, незалежна ад уласных фізічных якасцяў (брукаваная, грунтовая, наезджаная, гразкая), рэтранслюе, апрадмечвае яе для падарожнага чалавека знакавымі сустрэчамі і здарэннямі. Так, адна і тая ж дарога не роўная самой сабе ўдзень і ўночы, у полі, у лесе, балоце, каля храма, могілак ці карчмы, а тым больш у вузлавых пунктах яе разгортвання – на мосце, грэблі ці ростанях» [2, с. 322].

Вобраз дарогі ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях у цэлым трагічны, пранізаны пачуццямі горычы і роспачы, на што ўказваюць эпітэты – *крутая, бітая, запушчоная, не торная, не тарная, не праезджая, калодамі заваленая, не трапная, каменем пабітая, слёзанькамі палітая, працярэбленая, прамеценая, салдацкая, выбіваная, мураваная, бальшая, шырокая, курна, гладкая, сталбавая, расстайна, братняя*. Па дарозе на салдацкую службу выпраўляюцца рэкруты: «Пралягала там *дарожанька*, // *дарожанька* запушчоная. // *Шлях-дарожанька* не торная, // не тарная, не праезджая, // ўся калодамі завалена, // калодамі ўсё рэкруцкімі. // Той *дарожанькай* рэкрут вядуць, // з калодамі да замкнёнымі, // а за імі ўслед – жанок табун, // жанок табун да з дзіцяткамі» [4, №49]. Па ёй жа прыходзяць сумныя весткі пра смерць мілага на вайне: «*Бітым шляхам* салдаты едуць, // да й майго мілага каня вядуць» [4, №307].

У лірычных песнях лексема дарога спалучаецца з лічэбнікамі два, тры: «А ў полі, ў полі *тры дарожанькі*, // А там жа ішло тры салдацікі. // Адзін жа ідзець – песенькі пяець, // А другі ідзець – у скрыпачку йграець, // Трэці ідзець – сільненька плачэць. // Што к жане йдзець – песенькі пяець. // Што к мамачцы йдзець – у скрыпачку // Што к мачысе йдзець – сільненька плачэць. // Мамачка сына ды пераймала // Салодкім віном, белым пірагом. // А жана мужа ды пераймала // З беленькім сырам, з маленькім сынам. // Мачыха сына ды пераймала: // – Няўжо на свеце вайны не было, // Ды майго пасынка не забіла?» [1, с. 86–87]. У такіх выпадках яна, як правіла, сімвалізуе «дарогу жыцця», асабісты лёс, долю.

На дарозе лакалізуюцца жывыя істоты *(конь, беластоцкія палкі, афіцэры, навабранчыкі, рэкруты, стары казак, тры салдацікі),* расліны *(бярозка, каліна, рамон, смыродынька, хмыз), хата.* Сувязь з іншасветам тлумачыць з'яўленне там персаніфікаванай смерці: «Пайду, малада, я дарогаю, // я *дарогаю*, я *шырокаю*. // Спатыкалася я з *смертухнай*» [5, №198]. На гэта ж указваюць і тыповыя месцы яе лакалізацыі: *каля саду, у вішнёвым садзе, па той бок ракі, пад бярозкай, у даліне, пад калінай*. У. А. Лобач тлумачыць, што «дарога вядзе «за свет», г.зн. за межы «сваёй», засвоенай прасторы, таму полісемантычнасць тагасвету, які можа фігураваць як «чужая старана», свет памерлых, боскі сегмент светабудовы (неба) ці інфернальная сфера (пекла), мае выразную праекцыю і на сімвалічны статус дарогі. Адсюль сустрэць на дарозе можна было і «чужынцаў» (цыганоў, яўрэяў-гандляроў), і здані памерлых, а таксама чорта і самога Бога» [3, с. 319–320].

*Заросшая і замеценая дарога, дарога завісшая калінай* сімвалізуе перашкоды, якія складана або немагчыма пераадолець: «Як мне, брацейко, як мне, родненькі, // у гасцях у вас бываці? // *Пазарасталі сцежкі-дарожкі* – // Не магу пратаптаці. // – Наймі, сястрыца, наймі, родненька, // скрыпкі, цымбалы, // каб пратапталі сцежкі-дарожкі // да зялёнага гаю» [1, с. 20]. Выраз «*пазакідаць дарогу*» абазначае прадухіліць, спыніць нейкае дзеянне: «Здрада, здрада, чорненькія броўцы, я // ой, няверны міленькага слоўцы. // Як любіўся – жаніцца маніўся, // а цяпер ён мяне пакідаіць, // з ночы-поўначы каню аброк даець, // рана-раненька з двору выязджаіць. // – Не едзь, не едзь, мой міленькі, лесам // *пазакідаю дарогу* верасам. // Не едзь, не едзь, мой міленькі борам – // *пазакідаю дарогу* яворам» [1, с. 112].

Такім чынам, у беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях дарога надзелена выразнымі характарыстыкамі прасторавага памежжа: увасабляе сувязь паміж «сваёй» і «чужой» прасторай. У песнях яна сімвалізуе «дарогу жыцця», лёс; абазначае месца дзеяння; прамежак, які злучае пункты прасторы. Выразы тыпу «зарасці травой/бярэзнікам/дуб'ём/асіннікам», «пазавісаць калінай», «замесці», «завеяць» абазначаюць перашкоды. З канцэптам дарога звязаны матывы забрання ў рэкруты, ад'езду на чужую старану і інш.

**Спіс літаратуры:**


1. Лірычныя песні: беларускі фальклор у сучасных запісах / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 462 с.
2. Лобач, У. А. Дарога / У. А. Лобач // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – 140–141.
3. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад. сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі [і інш.] ; уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 488 с.
5. Сямейна-бытавыя песні / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; склад. І. К. Цішчанка ; склад. муз. ч. Г. В. Таўлай, рэд. т. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 752 с.

***Алена Кукрэш***

## ТЭМА ЗАБОЙСТВАЎ У “ЖОРСТКІХ” РАМАНСАХ

У беларускім фальклоры тэма забойстваў разглядаецца не ўпершыню. Даследчыкі казак [1, с. 151-156], [2, с. 166-167] і балад [2, с. 73-74] не раз сутыкаліся з трагічнымі вынікамі ў жыцці герояў твораў гэтых жанраў. “…Пераважна апавяданні пра незвычайныя драматычныя, часта трагічныя падзеі ў асабістым сямейным жыцці людзей…” [2, с. 73], – так апісвае навелістычныя балады вядомая фалькларыстка і даследчыца Л. Салавей. “Жорсткі” раманс не стаў выключэннем, а наадварот з’явіўся ўзорам для поўнага і паслядоўнага разкрыцця такой тэматыкі.

Тэксты рамансаў маюць вельмі спецыфічную тэматыку і моўнае ўвасабленне, і сама назва падкрэслівае ўхіл да трагічнай развязкі. Крывавыя забойствы са “зменшчыкамі каварнымі” і роднымі дзецьмі, каханымі і саперніцамі, – смакаванне сітуацый, вельмі падрабязнае апісанне расправы, у цэлым, не характэрныя для беларускага фальклору. Пры выкарыстанні архіўных і ўласна сабраных матэрыялаў быў складзены зборнік “Жорсткі раманс”, асобны раздзел якога мае назву “Трагічныя” [4, с. 19-90]. Ён уключае наступныя падраздзелы: “Забойства”, “Самагубства”, “Інцэст”, “Пакаранне”, “Падман”, “Адмова дзяцей ад бацькоў”, “Шлюб не па каханні”, “Прадказанні цыганкі”.

У дадзеным артыкуле мы разгледзім толькі матывы забойстваў у жорсткіх рамансах. У гэтым падраздзеле 155 тэкстаў, якія падзяляюцца паводле прынцыпа “*хто забіў*” (Дзяўчына, Хлопец, Маці, Бацька, Брат, Сястра, Муж, Любоўніца, Хуліганы, Загінула ўся сям’я), *“каго забілі”, “чаму і якім чынам”*. Тэматыка гэтага падраздзела нагадвае крымінальныя навіны. І сапраўды здзіўляе тое, што з-за няўдалага асабістага жыцця, неразздзеленага кахання, здрады, абурэння эмоцыі пачынаюць валодаць над розумам і забываецца нават кроўнае сваяцтва, абавязкі перад блізкімі людзьмі. Жорсткія рамансы гэтай групы можна падзяліць, зыходзячы з суб’екта дзеяння.

“Дзяўчына забівае” – гэты падраздзел ахоплівае 14 рамансаў, ён невялікі (для параўнання, у падрадзеле “Самагубства”, дзе галоўная гераіня дзяўчына, – 157 тэкстаў) і ўключае ў сябе наступныя падпункты, якія паказваюць, каго і якім чынам пазбавіла жыцця падманутая жанчына: хлопца (зарэзала), бо ён абяцаў лепшае гарадское жыццё, спакусіў дзяўчыну і пакінуў яе з сынам на руках, яна выпадкова сустракае мужа ў рэстаране, ён адмаўляецца ад яе і дзіцяці, яна яго заразае; хлопца (атруціла), бо ён спакусіў дзеўку, а браць замуж не хацеў: “Разгарэлася кроў у грудзі маладой, / Каця ножык у грудзі ванзіла: “За ізмену тваю, што ты бросіл, падлец, / І за всё я цебе атамсціла” [4, с. 19]; хлопца і сябе: афіцэр ад’язджае, дзяўчына плача, памірае, а назаўтра яго знаходзяць забітым у вагоне; хлопца, сябе і суперніцу: хлопец сустракаецца ўжо з іншай, але падманутая дзяўчына высочвае палюбоўнікаў і застрэльвае хлопца, яго новую сяброўку і сябе.

З прыведзеных прыкладаў бачна, што падманутую дзяўчыну не спыняе нічога, яна дазваляе пачуццям рэўнасці і помсты завалодаць сваімі дзеяннямі і нават не раскайваецца, забойства гучыць хлёстка, як прысуд нявернаму. Важна падкрэсліць, у гэтых тэкстах грамадства дзяўчыну не карае і не асуджае: “Цябе жэ я, Вася, прашчаю, / Но Бог не прасціць нікагда” [4, с. 25].

Наступны падраздзел “Хлопец забівае” ўключае 96 рамансаў. Амаль ва ўсіх тэкстах хлопец забівае дзяўчыну (толькі два выпадкі, калі забітыя мужчыны - гэта сапернік і багаты муж сваёй каханай), але розніца ў прычынах забойсваў, спосабах і пакараннях за гэтыя злосныя ўчынкі: кара хлопцу за забойства (23 тэксты) – хлопец заразае сваю былую каханую, бо сустрэў другую, у выніку яго чакаюць суд і турма; заразае дзяўчыну, бо яна яго пакінула ці здрадзіла; хлопец заразае сваю любую, бо яна яго пакінула ці здрадзіла, за гэта яго пакаралі (расстралялі, асудзілі, сам задавіўся): “У Колі быў ліворвель, шэ й гострой кінжал. Вэрочку ўрэзаў, а сам побежал” [4, с. 31]. У гэтых рамансах акцэнтуецца сур’ёзнае раскаянне, асуджэнне хлопцам і грамадствам такога ўчынка: “Яму, бандзіту, прысудзілі / Дванаццаць лет цюрмы сядзець” [4, с. 27]; “Яго злавілі, засудзілі / І далі катаргі сем лет” [4, с. 30]; “С табой я сдзелал прэступленье, / Пусць расстраляют і меня” [4, с. 30].

Але сустракаюцца тэксты, якія ўтрымліваюць у сабе словы павучэнняў і, з аднаго боку, нібы перасцерагаюць дзяўчат ад неабдуманых дзеянняў, а з другога боку – апраўдваюць хлопцаў-злодзеяў і перакладваюць частку віны на дзявочыя плечы: ”Мне мама гаварыла: “Не ўлюбляйся ў слесара. Слесарэй любіць апасна, яны рэжуцца нажом!” [4, с. 44].

Наступны матыў “хлопец застаецца непакараным” (73 тэксты), рэалізуецца ў тэкстах, дзе забойства застаецца без асуджэння і пакарання. Відавочна, гэта самы вялікі колькасна і разнастайны сюжэтна тэкставы шэраг “жорсткіх” рамансаў. Прычына забойства – нявернасць, здрада каханай: зарэзаў дзеўку нявераную; забіў дзяўчыну-цыганку (ці яе і саперніка, які аказаўся братам) за тое, што яна любіць цыгана, а не яго; хлопец забіў дзяўчыну-грачанку, бо заспеў яе з іншым; забіў багатага мужа сваёй каханай; зарэзаў дзяўчыну і сябе (бо “цярзала яго”) [4, с. 45]; застрэліў дзяўчыну, бо яна яму няверная, разлюбіла; былую каханку, якая адсудзіла